УДК 821. 161. 3. 09: 17

***З. П. Мельнікава***
*д-р філал. навук, праф., праф. каф. беларускай філалогіі*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
e-mail: pralih@mail.ru

# МАСТАЦКАЯ ХРОНІКА ТАТАЛІТАРЫЗМУ: АПОВЕСЦЬ В. БЫКАВА «АБЛАВА»

*В. Быкаў з незвычайнай глыбінёй асэнсоўвае трагедыйны вопыт нашай гісторыі, горкія ўрокі калектывізацыі. Выяўлена маральная пазіцыя пісьменніка-мысляра: гуманістычныя ідэалы, каштоўнасць кожнага чалавечага жыцця, хрысціянская маральнасць – аснова сацыяльнага і духоўнага жыцця кожнага чалавека і грамадства ў цэлым. Аповесць В. Быкава «Аблава» дапамагае сучаснікам зразумець маральна-палітычныя дэфармацыі эпохі таталітарызму, што стала драматычным вопытам беларускага народа. Гэты твор народнага пісьменніка – своеасаблівы помнік ахвярам таталітарызму ў Беларусі.*

Народны пісьменнік Беларусі В. Быкаў яшчэ не да канца ацэнены сучаснікамі як мастак і як філосаф-мараліст, які ў сваёй творчасці пакінуў запавет – адрозніваць дабро і зло, праўду і падман. Ён быў яшчэ і пісьменнікам-гісторыкам, які на ўласным лёсе зведаў трагедыі жыцця беларускага народа ў XX ст. – гвалтоўную калектывізацыю, сталінскія рэпрэсіі і вайну з фашызмам. Яго творы – мастацкія падручнікі, якія дапамагаюць сёння маладым пакаленням спасцігнуць вытокі і супярэчлівую сутнасць савецкага рэжыму, глыбока ўсведамляць трагізм беларускай гісторыі. Па сіле ўздзеяння на свядомасць і светапогляд беларусаў у другой палове XX – пачатку XXI ст. яму няма роўных.

В. Быкаў адным з першых звярнуўся да мастацкага асэнсавання і адлюстравання ў нашай літаратуры трагічных падзей нацыянальнай гісторыі 1920–30-х гг. У многіх творах пісьменніка сумяшчаюцца і ўзаемадзейнічаюць літаратурна-мастацкія, гістарычныя і маральна-філасофскія аспекты зместу і паэтыкі. Гэты пісьменнік, як ніхто іншы ў беларускай літаратуры, паказаў трагічныя зломы беларускай савецкай гісторыі, калі ўладу ў грамадстве атрымалі «бесы» (Ф. Дастаеўскі) – бальшавікі, разбуральнікі «старога» ладу і традыцыйнай хрысціянскай маралі. Творчасць пісьменніка каранямі ідзе ад драматычнага народнага вопыту.

Тэма гвалтоўных і бязлітасных сталінскіх рэпрэсій выразна гучала ў многіх творах пісьменніка яшчэ з 60-х гг. у выглядзе асобных эпізодаў, матываў, успамінаў герояў ваеннай прозы аб даваенным жыцці. Адносна самастойнае вырашэнне яна атрымала ў аповесцях «Знак бяды», «Сцюжа», апавяданнях «На Чорных лядах», «Перад канцом», «Жоўты пясочак» і інш. Аднак цэласнае, глыбокае і пераканаўчае ідэйна-мастацкае асэнсаванне гэта тэма атрымала ў аповесці *«Аблава» (1989).*

Аб задуме гэтага твора В. Быкаў у 1988 г. пісаў: *«У нас ёсць нямала велічных помнікаў ахвярам нямецкага фашызму… Але нішто яшчэ ў нас не напамінае пакаленням аб ахвярах сталіншчыны. Тое няправільна і недаравальна! Мы павінны памятаць аб іх – не героях, а бязвінных ахвярах тырана – спрацаваных рабочых, галодных калгасніках, першых народных інтэлігентах, мужчынах і жанчынах, – якія з куляю ў патыліцы клаліся ў самімі ж выкапаныя ямы, вымаўляючы не праклёны, не пратэст, а адзінае марнае і трагічнае слова: “Завошта?” Яны ўжо ніколі не пачуюць адказ на тое сваё пытанне, затое адказ на яго павінны зразумець мы».*

Аповесць «Аблава» ўражвае мужнасцю погляду пісьменніка на лёс беларускага сялянства ў гады сталіншчыны, у часы гістарычнага эксперыменту ўлад над сваім наро-

дам. Некаторыя гісторыкі выказваюць меркаванне, што ў гады калектывізацыі Беларусь страціла больш за тры мільёны чалавек. Аповесць В. Быкава «Аблава» нельга ўспрымаць толькі як мастацка-літаратурны твор, гэта яшчэ псіхалагічна дакладная сацыяльна-гістарычная хроніка знішчэння беларускага сялянства. Многія архіўныя дакументы аб тых падзеях былі страчаны або свядома знішчаны ў час вайны. Пісьменнік добра ведаў, што ў гады калектывізацыі людзей высылалі часам цэлымі вёскамі, і лёсы многіх з іх так і засталіся невядомымі і не ўлічаны афіцыйнай статыстыкай.

В. Быкаў успамінаў, што аповесць «Аблава» напісана на аснове рэальных падзей і лёсаў, пра якія ён даведаўся ў адзін з прыездаў дадому ад знаёмага жыхара вёскі Кублічы Ушацкага раёна. Ён расказаў пра трагічны лёс земляка, які, пахаваўшы ў высылцы на Поўнач жонку і дачку, «адолеўшы тысячу кіламетраў, апынуўся на родным котлішчы і на адзіноце паплакаў. Але на тым і скончылася ўсё яго шчасце вяртання… Яго пазнаў першы ж сустрэты ранкам сусед. І ўжо надвячоркам на яго пачалі паляваць, наладзілі аблаву, у якой – во драма! – вымушаны быў прымаць удзел і яго сын…» [1, с. 516]. Ніколі ў гісторыі ніводнага народа не было, каб сын паляваў на гвалтоўна абылганага, несправядліва асуджанага роднага бацьку. Прымусовая калектывізацыя вынішчала гаспадарлівых беларускіх сялян. З бязлітаснай праўдзівасцю В. Быкаў паказаў, як на зруйнаваных сядзібах бацькоў засталіся бяздумныя, бязродныя сыны з так званымі «новымі людзьмі».

Галоўная ідэя твора – выкрыццё амаральнасці сталіншчыны, якая не толькі фізічна знішчала тысячы годных людзей, але і расчалавечвала слабых, растоптвала ў іх душах спагадлівасць, міласэрнасць і здольнасць адчуваць чужы боль, звычайную суседскую прыязнасць, сяброўскія і сваяцкія пачуцці. Кожнай старонкай твора В. Быкаў сцвярджае, што самае страшнае злачынства сталінізму – разбурэнне духоўнасці і маральнасці, страты пачуцця самазахавання ў народзе. Гэта, у быкаўскім разуменні, катастрофа: гвалт над непавіннымі людзьмі, знішчэнне чалавека-гаспадара, здзек улад з асабістай годнасці ніколі не павінны паўтарыцца.

Гэтае аўтарскае перакананне выяўлена праз разгортванне сюжэтных падзей, сістэму герояў аповесці «Аблава» і найперш – праз трагічны лёс галоўнага героя, беларускага селяніна, а потым «спецперасяленца» Хведара Роўбы.

Сюжэт твора надзвычай драматычны. Аповесць пачынаецца з апісання пакутніцкай дарогі галоўнага героя, які ўцёк з высылкі і трэці месяц прабіраецца ў родныя мясціны на развітальны паклон роднай зямлі. Тут жылі яго продкі, тут вырас і жыў у цяжкай працы і ён. У час калектывізацыі Хведар быў беспадстаўна залічаны да ворагаў-кулакоў, бо набыў малатарню, якой карысталіся і суседзі, аднавяскоўцы. Праз пяць год высылкі ён уцёк з далёкага паўночнага Котласа і незаўважна для ўсіх хоча прабрацца ў родную вёску Нядолішча, каб даведацца пра сына і паглядзець на шчаслівае жыццё ў калгасе, аб чым так многа і з перакананнем гаварылі савецкія кіраўнікі, арганізатары калгасаў.

Дарога ў аповесці набывае абагульнена-сімвалічны сэнс – пакутніцкі гістарычны шлях беларускага народа, а праз перадачу думак героя ў дарозе пісьменнік паказвае драматычныя падзеі яго мінулага жыцця. Так праз успаміны героя аўтар выяўляе рысы яго характару і глыбіню перажытых пакут. На чужыне, у халоднай зямлі засталіся жонка і дачка Хведара, ім не суджана было вярнуцца ў родныя мясціны: *«Прыбраў бог на чужой старане, навекі супакоіў над жвіровым абрывам далёкай сцюдзёнай ракі»* [2, с. 366]. Пасля смерці ў высылцы жонкі і дачкі жыццё для Хведара амаль цалкам страціла свой сэнс. Але ў родных мясцінах пасля службы ў савецкім войску застаўся яго сын Міколка. Яшчэ да арміі ён быў актыўным, старанным камсамольцам. А зараз, дачуўся бацька, яго

сын стаў у раёне вялікім начальнікам. Але гэта мала цешыла Хведара, бо сын ні разу не пацікавіўся лёсам сваёй сям'і. Больш таго, Хверар чуў, быццам бы сын выракся сваіх бацькоў. Раскулачанаму без падстаў селяніну больш за ўсё хацелася апошні раз у жыцці паглядзець на сваю зямлю, сядзібу, куды былі ўкладзены яго праца, сіла: на хату, сад, на гаспадарчыя пабудовы, на ўсё, што ён здабыў уласнымі сіламі, зрабіў сваімі рукамі. Хведар раздабыў дакумент на чужое прозвішча і цвёрда вырашыў уцякаць з высылкі. Некалькі папярэдніх уцёкаў былі няўдалымі, яго даганялі, вярталі і жорстка каралі. І вось зараз ён ужо на роднай зямлі. Герою невыносна крыўдна, што ён, як злодзей, павінен хавацца ад людзей, прабірацца да свайго двара крадком.

В. Быкаў падрабязна, з мастацкай дакладнасцю пісьменніка-псіхолага апісвае выгляд героя, чалавека надта худога, немаладога веку. *«На даўно не голеным твары чырванеў даўгі прастуджаны нос, з-пад святлявых броваў насцярожана зыркалі шэрыя вочы. Рот яго быў трохі разяўлены – ад стомы ці залішняй увагі, з-пад абвіслых вусоў вытыркаліся два ніжнія зубы, іншых спераду не было відаць. Дыханне ў чалавека чулася сіпатае і частае – усё ж, мусіць, далася яму ў знакі гэтая хада…*

*Відаць было па ўсім, што чалавек даўно ішоў адзін, звыкся са сваёй адзінотай і старанна абмінаў людзей. Людзі для яго былі найвялікшаю небяспекай… ці не таму ён выбіраў шлях воддаль ад дарог, між параснікаў і балацявін або цераз лес»* [2, с. 366].

Пісьменнік рознымі спосабамі падкрэслівае трагічную адзіноту героя і безвыходнасць становішча гэтага бязвіннага чалавека. Сапраўды, людзі, асабліва знаёмыя, былі для Хведара найбольшай небяспекай. За час сваіх блуканняў ён нават адвык ад чалавечага голасу, сам маўчаў, толькі напружана ўзіраўся і ўслухоўваўся ў наваколле. Менш баяўся ён статка, разы тры падыходзіў да пастушкоў, яму давалі чаго-небудзь перакусіць. Адна дзяўчынка-пастушка, якая вельмі нагадала яму памерлую ў высылцы дачушку Волечку, нават пачаставала яго кавалачкам сала. Адышоўшыся, расчулены Хведар заплакаў першы раз пасля таго, як пахаваў дачку.

Хведар зайздросціць людзям, якія спакойна ходзяць па сваёй зямлі і не здагадваюцца нават, як цяжка, невыносна жыць на чужыне. Напружаны трагізм перажыванняў героя аўтар перадае праз унутраны маналагізм: *«Божа літасцівы, чаму ж я такі нешчаслівы? – звыкла падумалася Хведару, як думалася амаль штодня ўсе пяць гадоў ягоных пакут. – Жывуць людзі спакойна, ходзяць па роднай зямельцы, і, мусіць, ніхто не ведае, як без яе… А ён, калісьці гвалтам адарваны ад яе, здаецца, здзічэў нутром ад самоты па ёй, спарахнеў розумам»*, – так перадае В. Быкаў горкія думкі і ўнутраны стан свайго героя [2, с. 367].

Аўтар-псіхолаг дакладна перадае, з якім трапяткім хваляваннем герой прабіраецца праз лес, дзе некалі была яго дзялянка дроў, як асцярожна, каб не сустрэцца са знаёмымі людзьмі, мінае знаёмую дарогу, *«якою калісьці ездзіў на станцыю, у мястэчка, малы – з бацькамі на кірмашы. Затым у раён да начальства, колькі разоў вазіў нарыхтоўкі збожжа, падатак просты і два разы цвёрды»* [2, с. 367]. Асабліва асцерагаецца герой, і гэта падкрэслівае пісьменнік, нечаканых сустрэч з мужчынамі, *«маладымі хлопцамі, дзеўкамі, якія хутка маглі яго затрымаць, здаць у міліцыю. На маладых надзеі не было ніякай, тыя цяпер спрэс камсамольцы, выхаваныя ў нянавісці, падазрэнні да кожнага чужога, незнаёмага…»* [2, с. 367–368].

Так праз думкі героя аб небяспецы сустрэчы з камсамольцамі пісьменнік ускосна гаворыць аб атмасферы падазронасці і нянавісці ў тагачасным грамадстве, аб палітызаванасці савецкага жыцця, аб маніпуляцыях светапоглядам моладзі з боку таталітарнай партыйнай ідэалогіі.

З эмацыйнай напружанасцю і псіхалагічнай дакладнасцю В. Быкаў перадае кульмінацыю пакутнага шляху героя: нарэшце ён дасягнуў мэты, убачыў стрэхі роднай, маленькай вёскі Нядолішча з яе неўрадлівымі палямі. Родная вёска, нягледзячы на яе звычайнасць і беднасць, была для Хведара самым дарагім і жаданым месцам на вялікай зямлі. Тут прайшлі яго маладыя гады, тут калісьці ён паверыў у шчаслівую будучыню.

Праз успаміны героя, яго думкі, унутраныя маналогі В. Быкаў пераносіць чытача ў 1930-я гг., паказвае калектывізацыю, адносіны ўлад да чалавека ў тыя гады.

Хведар Роўба вырас у вялікай сялянскай сям’і, дзе сямейнікаў *«было восем душ, з іх пяць мальцаў»*. Ён сумленна, цягавіта выконваў усякую работу, *«біўся зімой і ўлетку як рыба аб лёд, і будаваўся, абрабляў палеткі. Стараўся спраўна плаціць падаткі і пазыкі»* [2, с. 369]. Герой шукае адказу на балючае пытанне: завошта яго пакаралі, чаму людзі з ім абышліся так жорстка і несправядліва? Ён жа заўсёды з павагай ставіўся да ўлады, быў шчыра ўдзячны ёй, што дала яму, бедняку, зямлю. Савецкую ўладу ён лічыў сваёй, але яна ашукала яго жорстка і бязлітасна. Роўба крыўдаваў і на людзей, якія ведалі яго змалку: чаму ніхто з аднавяскоўцаў за яго не заступіўся? Разам з тым Хведар разумеў, што, магчыма, яго даверлівыя аднавяскоўцы і не лічылі яго ворагам, але заступіцца за яго яны проста баяліся, бо ніхто не хацеў рызыкаваць сваім лёсам. Кожны баяўся трапіць у няміласць улад. Герой многа і пакутліва раздумвае над маральным зломам, што адбыўся пад прэсам «новай улады» ў грамадстве і ў свядомасці яго аднавяскоўцаў. Да яго прыходзіць разуменне: *«Дабрыня, мусіць, там, дзе справядлівасць і праўда. Дзе класавая бязлітаснасць, жорсткасць вышэйшых да тых, хто ніжэй, якая ж там дабрыня! Мусіць, навек адышла дабрыня з мінулым часам, на змену ёй паявілася нешта новае – жорсткае і няшчаднае»* [2, с. 384].

На вобразе Хведара Роўбы пісьменнік стварае тып сумленнага і трывушчага беларускага селяніна. Сціплага, стрыманага чалавека Роўбу часта ашуквалі хітрэйшыя і не зусім сумленныя суседзі, радня, аднасяльчане, начальства. Ашуквалі яго і ў высылцы таварышы па няшчасці. Ашуквалі таму, што для розных прыстасаванцаў да ўлады ён быў нязручным чалавекам, бо жыў па сумленні і ніколі не шукаў выгоды. Руплівы гаспадар, заняты штодзённым сялянскім клопатам, ён быў далёкі ад палітыкі. Але сваёй штодзённай працай сцвярджаў перавагу над актывістамі-балбатунамі.

У Хведара ўзнікала непаразуменне: чаму калгасам кіруюць няўмекі, а не руплiўцы-гаспадары. Яго абурала, што самы лянівы ў Нядолішчы гаспадар, Зміцер, у якога некалі ад голаду здохла кабыла, бо з’ела за зіму саламяную страху і ўсё роўна не хапіла, стаў брыгадзірам. Гэты чалавек за жыццё нават не навучыўся плесці лапцей, яму заўсёды пляла жонка. І гэты лайдак зараз кіруе іншымі, распараджаецца людскімі лёсамі…

З выпадковай сустрэчы з калгаснікамі суседняй вёскі Хведар даведаўся, што калгаснікі галадаюць: *«З Вялікадня да Іллі траўку елі. З Іллі пачалі патроху бульбачку капаць. Ды… якая там бульбачка! Арэхі… Аднаго і паратунку, што кароўка, малачко! Ды і тое здаць трэба. Дзвесце літраў. І мяса, і яйкі, і воўну. Зімой асмалілі падсвінка, дык штраф далі пяцьдзясят рублёў»* [2, с. 387]. Хведар робіць трапнае параўнанне, што ў калгаснікаў амаль тое ж галоднае жыццё, што і ў высылцы. Толькі адна палёгка, што пакутуюць калгаснікі на сваёй роднай зямлі.

Аўтар асабліва падкрэслівае кроўную прывязанасць героя да роднай зямелькі. Нязмерная, трапяткая любоў да яе зноў і зноў выяўляюцца праз думкі, маналогі Хведара. Чалавек, па яго глыбокім перакананні, без роднай зямлі нішто. Нават памерці на радзіме, легчы ў родны пясочак для Хведара – вялікае шчасце. Ноччу герой блукае па вясковых могілках на ўскраіне вёскі і зайздросціць тым, хто навекі супакоіўся ў роднай зямлі:

*«То былі тутэйшыя могілкі з усёй яго раднёй, старымі, дзядамі і прадзедамі – усім яго родам, і шмат якімі вясковымі родамі, што адышлі, аджылі сваё, адпакутвалі. Зайздросная ўсё ж доля, падумаў Хведар: навек разам з усімі, у сваім кутку. А ягоная жонка Ануля, спакутаваная вясковая кабета, не ашчаслівілася нават і гэткаю доляй – легла ў балотную ямку пад сцюдзёным Котласам…»* [2, с. 370].

Пакутлівыя развагі героя аўтар увесь час чаргуе з апісаннямі прыроды. Пануры, смутны, сцюдзёны восеньскі пейзаж роднай зямлі падкрэслівае трагізм становішча Хведара. Родныя лес, балота, поле, яго здзічэлы сад, разбуранае котлішча – усяму сваёй спакутаванай сялянскай душой малітоўна кланяецца ён. Здаецца, што і саду, і лесу, кожнаму дрэўцу і кусціку гэтак жа пякельна балюча і няўтульна на роднай зямлі, як і Хведару.

Як ні асцерагаўся Хведар, яго ўсё ж убачылі аднавяскоўцы. На ўцекача, «ворага народа», наладжваецца аблава. Апісанне яе – самыя балючыя і трагічныя старонкі твора. Гаспадар зямлі, які ўмее і любіць працаваць на ёй, ні ў чым не павінны чалавек стаў выгнаннікам з Бацькаўшчыны. Сталася так, што яму ўвогуле няма месца на зямлі, няма месца ў жыцці. Толькі нейкі час Роўба адчуў сябе вольным, хаваючыся ад людзей. Але менавіта ў гэтыя тры месяцы ўцёкаў ён быў вольны ад прымусу, нагляду, меў магчымасць быць сам-насам з сабой, з гаротнымі думкамі аб сваім чалавечым лёсе, са шчымлівымі ўспамінамі аб сваёй гаспадарцы, зямлі і працы.

Уцёкі быкаўскага героя з высылкі дадому – гэта выклік безвыходным абставінам. Яго трагічнае вяртанне дадому на працягу ўсяго твора суправаджаецца спавядальным роздумам селяніна-праўдашукальніка: «За што?» Хведару прыходзіла думка: магчыма, яго жорсткі лёс і ёсць *кара ад Бога* за тое, што ён маўкліва дазволіў некалі Міколку вынесці з хаты абразы, а замест іх сын-камсамолец прывалок у хату вялікі партрэт Карла Маркса.

Зноў і зноў, тэкстам і падтэкстам аповесці пісьменнік паказвае супрацьстаянне сумленнага чалавека і жорсткіх абставін, супраціўленне асобы гвалтоўным парадкам, пазбаўленым справядлівасці, духоўнасці і волі. У новым жыцці, паказвае В. Быкаў на лёсе свайго героя, няма месца сумленнасці, а нявольніцтва і людскія пакуты сталі звычайнай з’явай і доляй непавіннага чалавека. Перадаючы светаадчуванне героя, уцекача з таго свету, В. Быкаў піша: *«Цяпер ён здань, начны, бесцялесны прывід, ад якога жахаюцца людзі, месца якому, мабыць, побач з ваўкамі ў лесе»* [2, с. 427].

«Кулацкую морду», як пагардліва называе Хведара аблава, заганяюць, нібы звера, у багну. Ён нічым не можа сябе суцешыць у апошнія хвіліны жыцця. Наадварот, на ўласным лёсе ён выразна спазнаў, што свет расчалавечыўся: *«Чалавек бы не ўцякаў ад людзей, ён нешта сказаў бы, і яго паслухалі. Значыць, ён ужо і не чалавек... Людцы, завошта вы так? Што я зрабіў кепскае вам?... Ці ж я хацеў каму кепскага?.. Толькі ж завошта мяне так люта? Людцы, адумайцеся!..»* [2, с. 428–429].

У аблаве на Хведара ўдзельнічаюць блізкія суседзі, людзі, якім ён не зрабіў зла, а толькі спрыяў і дапамагаў. Але самае горкае, што кіруе аблавай сын уцекача – Міколка. Ён пазнае сына, шкадуе і апраўдвае яго ў апошнія мінуты жыцця: *«Бедны Міколка! І яму во лезці сюды! Мусіць, аднак, не ад салодкай жызні»* [2, с. 430].

Хведар Роўба – моцны сваім характарам, як і іншыя героі В. Быкава. Загнаны аблавай у дрыгву, ён да канца захоўвае волю, імкненне застацца сабой і недасягальным для нелюдзяў. *«Ён не хаваўся наогул. Ён ужо быў для іх недасяжны. Ён яшчэ не дабрыў да таго свету, але ўжо бадай што сышоў з гэтага. На гэтым засталася хіба ягоная галава і вочы. Каб астатні раз зірнуць і развітацца»* [2, с. 431].

Хведар не шкадуе пакідаць свет, які прагнаў яго, не прызнаў сваім. Апошняе, што яго турбуе, – перараджэнне яго сына, які выракся бацькі, здрадзіў усяму роду: *«Калі такое магчыма, тады як жа жыць? Можа, яму яшчэ загадаюць, злавіўшы, учыніць допыт над бацькам? І сын зможа яго катаваць? Божа! Нашто ты сатварыў тады белы свет?»* [2, с. 431].

Пісьменнік-мысляр В. Быкаў у кожным творы задумваецца над маральна-этычнай, духоўнай сутнасцю чалавека. Як са звычайнага вяскоўца фарміруецца здраднік, кат? Пад уплывам чаго? Гэтым аўтарскім роздумам абумоўлены вобразы-тыпы вясковых актывістаў Івана Сокура, Зміцера Цыпрукова, селькора Зыркаша, сына галоўнага героя Міколкі Роўбы, некаторых іншых. Іван Сокур – старшыня сельсавета, які памагаў савецкім актывістам у Нядолішчы раскулачваць Хведара. Іван быў сынам разумнага, паважанага ў вёсцы селяніна-серадняка. Яго бацька ніколі не шкодзіў людзям, а, наадварот, дапамагаў у цяжкую хвіліну. Аднак не ў бацьку, спагадлівага, маральнага чалавека, удаўся сын. Іван меў падатлівы характар, і раённае начальства ім папіхала. Калі высылалі Роўбу, ён быў наглядчыкам і рупным памагатым двух упаўнаважаных з раёна, сачыў, каб раскулачаныя, як было загадана, узялі з сабой толькі пілу, тапор ды харчоў на тры дні. Новыя, чорныя Волеччыны валёнкі кінуліся ў вочы аднаму з раённых упаўнаважаных, і ён аддаў загад Сокуру. *«Сокур трохі паняўся, перасмыкнуў голеным тварам, але падступіў да дзяўчынкі і перадаў загад. Волечка паслухмяна здзела адзін чорны валёначак, затым другі і засталася ў снезе ў адных панчошках…»* [2, с. 397].

Але ці не спасцігла Сокура справядлівая кара Усявышняга, думае Хведар, бо сярод знаёмых магіл на вясковых могілках ён бачыць недагледжаную магілу з надпісам на белай дошцы: «Сокур Іван». Пяць гадоў назад гэты начальніцкі памагаты быў здаровы, дужы і рухавы сярэдняга веку чалавек. Сокур у быкаўскім творы ўвасабляе тых людзей, што імкнуліся прыстасавацца да ўлады і былі гатовыя на ўсё, каб выслужыцца і засведчыць ёй сваю вернасць. Без пакут сумлення гэты актывіст распараджаецца лёсамі людзей, бяздумна дзейнічае па ўказцы начальства. Старшыня сельсавета гатовы ўсё знішчыць, магчыма і забіць чалавека, калі на гэта будзе загад начальства. З такіх людзей, па перакананні пісьменніка, нараджаюцца самыя агідныя здраднікі і к**а**ты.

Каінавы паслугі аказвае новай уладзе яшчэ адзін жыхар Нядолішча – Зыркаш. Хведар упэўнены, што менавіта ён сапсаваў усё жыццё яго сям'і, і не толькі ёй адной. Зыркаш – зайздросны, нядобры чалавек. Гэта ён калісьці напісаў на Роўбу скаргу за малатарню. З гэтага і пачаліся беды Хведара. Каб не паклёпніцкая заява гэтага зайздросніка, можа б усё па-людску абышлося, і Роўба не спазнаў бы такога трагічнага лёсу.

Уцякаючы ў балота, Хведар пазнае ў сваіх праследвальніках знаёмых, якім ён не зрабіў нічога дрэннага: Шурку, якога некалі выключылі з камсамола, сваіх былых суседзяў. Гэтыя людзі добра ведалі Хведара як працавітага сумленнага чалавека. Што ж іх прымусіла дамагацца яго смерці і ўдзельнічаць у гэтай аблаве? Чаму ён стаў ім небяспечным, ён жа дапамагаў суседзям ва ўсім?.. Можа, і яны запалоханыя?.. Разам з героем чытач сам павінен адказаць на гэтыя драматычныя пытанні.

Уцякач кіруецца туды, дзе бачыць адзінае выйсце – у непраходнае балота Багавізна, туды, дзе вечная і бяздонная багна. Аблава на Хведара нагадвае эпізоды партызанскай аповесці В. Быкава «Воўчая зграя». Але ў аналізуемым творы лютай звярынай зграяй аказваюцца свае людзі, а не чужынцы, фашысцкія карнікі. Гэта дае падставы правесці некаторыя паралелі: бесчалавечнасць, якую насаджаў таталітарны рэжым, нагадвае фашызм.

Аднак самым страшным у маральным падзенні з’яўляецца сын Роўбы Міколка. У дзяцінстве хлопчык быў вельмі чулым, спагадліва ставіўся да ўсіх, нават жывёлу не крыўдзіў. Ён радаваў бацькоў сваёй працавітасцю. Сям’я мела някепскую па тым часе гаспадарку, бо змаглі купіць малатарню, ды і падрос сын-памочнік. *«Міколка надта прыхільна памкнуўся да зямлі і гаспадаркі, рана пачаў працаваць плячо ў плячо з бацькамі… Ды неўзнарок неяк улёг у навуку – спярша ў школе, затым – як уступіў у камсамол»* [2, с. 374]. Так, падкрэслівае В. Быкаў, «новая навука» вытруціла з душы сялянскага сына любоў да зямлі і працы на ёй. Міколка стаў удзельнікам бясконцых сходаў, мітынгаў, спрэчак аб новым жыцці. А калі стварылі камсамольскую ячэйку, выбралі яго сакратаром. Хлопцу стала зусім не да гаспадаркі, ён стаў чужынцам для роднай сям’і.

Бацькоў выслалі па сутнасці з-за малатарні, якую сям’я нажыла па парадзе Міколкі, каб весці «культурную гаспадарку» ў сябе і дапамагаць іншым. Хлопец у гэты час служыў у войску. Вярнуўшыся дадому, ён нават не захацеў пацікавіцца лёсам бацькоў, куды іх выслалі, ці жывыя яны і сястрычка Волечка… Ён не хацеў нічога чуць аб родных. Бацькі ж увесь час бедавалі аб сыне, але не адважваліся яму нават пісаць, каб не пашкодзіць яго жыццю, будучаму. Спадзяваліся, што Міколка напіша ім сам. *«Тамаш (аднавясковец. – З. М.) пісаў, што бачыўся з ім у раёне, значыцца, мог бы даznацца бацькаў адрас, – думаў Хведар. – А калі не піша, дык значыць… І дзень, і ноч ён думаў, вагаўся і – так нічога і не ўдумаў. Ён не ведаў, як паставіцца яму да сына, а галоўнае – як сын паставіцца да яго… Хведар шмат начэй думаў пра сына і яго начальніцкую пасаду, непакоіўся і перажываў. І ўсё стаяла ў думках, што сказаў Сталін: сын за бацьку не адказвае… Калі Міколку паставілі ў раёне начальнікам, дык, мусіць жа, ведалі, дзе бацька і маці… Можа, даўмеліся нарэшце, што раскулачылі няправільна, незаслужана, і таму сын ні пры чым…»* [2, с. 375].

Дарэмна Хведар спадзяваўся, калі сын вялікі начальнік, дык можа як-небудзь аблегчыць лёс бацькі, які яго гадаваў, вучыў. Мікола баяўся, што дзеці раскулачаных таксама могуць падвяргацца рэпрэсіям. «Разумны» Міколка зрабіў кар’еру: адрокшыся зусім ад роднага бацькі, ён стаў партыйным сакратаром раёна. Пад націскам абставін у той час так рабілі многія. Але, як даведаўся Роўба, яго сын вызначаўся асаблівай лютасцю ў адносінах да людзей. *«Малады, а як цівун той»*, – казалі пра Міколу людзі. Ён нават адрокся ад бацькавага прозвішча – памяняў на іншае. Хведар гатовы быў сыну многае дараваць, але каб памяняць прозвішча ды стаць цівуном… Для бацькі няма большай ганьбы, чым мець такога сына. Герой В. Быкава пакутліва раздумвае: як і чаму яго сын ператварыўся ў нелюдзя?.. Бацькі ж вучылі яго быць добрым, спагадлівым да людзей. Але былі ў камсамольца Міколкі і іншыя настаўнікі. Юнак аказаўся маральна слабым чалавекам, калі ў яго душы не засталося месца дабру і справядлівасці, спагадзе і міласэрнасці. Ён без сумненняў прыняў ідэі «новага жыцця», і ніхто разумны не перасцярог Міколку аб нерэальнасці ідэй сусветнай рэвалюцыі, аб грахоўнасці жорсткіх адносін да людзей, родных і ўсіх іншых. Міколка, як і іншыя актывісты таго часу, захапіўся сацыялістычнымі ідэямі аб шчасці ўсяго чалавецтва і не задумваўся аб няшчасці блізкіх і родных людзей, тых, каму ён ламаў лёсы. Гэта – таксама тыповы геройпрыстасаванец і кар’ерыст. Рукамі такіх «актывістаў» здзяйсняліся многія злачынствы таталітарнай улады супраць свайго народа.

В. Быкаў па-грамадзянску смела і пераканаўча паказваў антыгуманнасць ідэй таго часу, якія спрыялі адрачэнню сыноў ад сваіх бацькоў. Сын ішоў супраць бацькі і не нёс за гэта ніякай маральнай адказнасці, людскога асуджэння і віны. Гэта пярэчыла хрысціянскім і агульначалавечым нормам, маральную безадказнасць і жорсткасць несла тата-

літарная ідэалогія. Менавіта Міколка ў канцы быкаўскага твора ўзначальвае злавесную аблаву на роднага бацьку. Сын стаў зусім чужым, адрачэнцам, здраднікам сваім людзям, свайму роду і зямлі. Ён аддана служыць сістэме, якой ён і патрэбны менавіта бязродным, амаральным, без сумлення і святых пачуццяў у душы.

Магчыма, у гэтым вінаваты і сам бацька? Ён некалі не запярэчыў сыну, які выкідаў з хаты абразы. Тады Хведар не дужа над гэтым задумваўся, хоць *«трохі шкада было святых, з якімі мінала жыццё, але… калі тое робіць сын ад імя ўлады… усё ж уладзе ён верыў. Лічыў, што там недзе, у Маскве ці ў Мінску, сядзяць разумныя людзі, адукаваныя і справядлівыя, і калі яны вырашылі, што без бога народу лепш, дык, мабыць, гэтак і трэба»* [2, с. 416]. У гэтых развагах аўтар падкрэслівае даверлівасць, недалёкасць і наіўнасць свайго героя-селяніна, які шчыра верыў савецкай уладзе.

І тут В. Быкаў застаецца верным праўдзе, хоць яна вельмі жорсткая. Але без сумленнага, праўдзівага адлюстравання гісторыі народа, быў перакананы пісьменнік, не можа быць вартай, годнай будучыні. Пісьменнік спадзяваўся, што, дзякуючы яго праўдзе, у будучым беларусы не паўтораць трагічных памылак сваёй гісторыі. Сродкамі мастацкага слова Быкаў-мысляр асуджаў таталітарызм, паказваў, як у нечалавечых абставінах «калгаснага будаўніцтва» руйнаваўся свет вясковага, народна-хрысціянскага ўкладу жыцця, як разбуралася чалавечая мараль – аснова суіснавання людзей і грамадства. На думку пісьменніка, разбурэнне чалавека і расчалавечванне свету, адмаўленне грамадства ад гуманістычнай маралі і духоўнасці, знішчэнне чалавека-гаспадара – вось галоўныя наступствы таго супярэчлівага і трагічнага часу, якія тлумачаць многія дэфармацыі ў савецкім грамадстве наступных дзесяцігоддзяў.

Балючая праўда нашай гісторыі патрэбная сучаснікам, каб годна ўвекавечыць памяць пра ахвяр сталіншчыны, каб нашчадкі вынішчанага таталітарнай сістэмай ахвярнага пакалення ніколі не забывалі, што сярод тысяч загубленых суайчыннікаў найбольш было непавінных працаўнікоў, вяскоўцаў-беларусаў. Сёння іх цяжка назваць па імёнах, цяжка адшукаць магілы высланых на спецпасяленні. В. Быкаў аповесцю «Аблава» стварае ім усім велічны і самотны рэквіем. Назва аповесці – ёмістая метафара таго, як знішчаліся многія мільёны сялян і гуманістычная народная мараль не толькі беларускага народа, але і многіх народаў вялікай савецкай краіны. Гэта аблава на ўсё мужнае, сумленнае, годнае, што было ў людзях і што супрацiўлялася злачыннай палітычнай сістэме.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Быкаў, В. Доўгая дарога дадому / В. Быкаў. – Мінск : Кніга, 2003. – 544 с.
2. Быкаў, В. У. Збор твораў : у 6 т. – Мінск : Маст. літ., 1992–1994. – Т. 5. – 1994. – 432 с.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 04.11.2019

***Melnikava Z. P.*** **Artistic Chronicle of Totalitarianism: V. Bykov's Story «Battue»**

*V. Bykau with extraordinary depth comprehends the tragic experience of our history, the lessons of collectivization. The moral position of the writer-thinker: humanistic ideals, the value of every human life, Christian morality – the basis of social and spiritual life of each person and society as a whole is revealed. V. Bykau's story «Battue» helps contemporaries to understand the moral and political deformations of the era of totalitarianism, which became a dramatic experience of the Belarusian people. This work of the people's writer is a kind of monument to the victims of totalitarianism in Belarus.*